**Класная гадзіна “Быць патрыётам: адказнасць і гонар”**

**Мэта:** фарміраванне грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы навучэнцаў праз далучэнне да сацыякультурных каштоўнасцей беларусаў.

**Задачы:**

– стварыць умовы для абагачэння ўяўленняў вучняў пра якасці грамадзяніна-патрыёта і адказнасць за іх;

– падахвочваць дзяцей да самааналізу свайго пачуцця патрыятызму і выхоўваць павагу да Радзімы.

**Форма правядзення:**

**Абсталяванне:** тлумачальны слоўнік, дыдактычная гульня-лата, працоўны ліст, кветка-васілёк

**Ход класнай гадзіны**

**I. Арганізацыйны момант** (падрыхтоўка да класнай гадзіны, стварэнне станоўчага псіхаэмацыйнага настрою)

*Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае – гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць.* (Урывак з прадмовы да “Кнігі Юдзіф” Францыска Скарыны).

***Настаўнік:*** Радзіма заўсёды займае ў жыцці чалавека ганаровае і важнае месца. Асабліва тады, калі яна побач, калі ёю дыхаеш, п’еш ваду з яе крыніц, бачыш яе прыгажосці, дыхаеш штодня яе паветрам, чуеш родную мову.

Ці лёгка жыць без Радзімы? Гэта залежыць ад многіх рэчаў і, у першую чаргу, ад таго, якія мы патрыёты сваёй Радзімы, наколькі мы любім і шануем родны край. Ці зможаце вы сёння адказаць на пытанне: Я – патрыёт сваёй краіны? Чаму? Хто такія патрыёты?

*Франтальная гутарка з вучнямі па акрэсленых пытаннях*

**II. Асноўная частка**

**Групавая праца. Прыём “Асацыятыўны рад”**

- Напісаць у слупок словы-асацыяцыі, звязаныя з тэмай класнай гадзіны.

- Даць азначэнне атрыманым словам-асацыяцыяцым, параўнаць са слоўнікавым варыянтам.

***Настаўнік:*** Якога чалавека мы можам назваць патрыётам? Складзіце ў групе асацыятыўны рад “Патрыёт. Хто ён?” і прэзентуйце сваю сумесную творчую працу.

1. Кожны, хто любіць тое месца, дзе нарадзіўся і вырас.
2. Той, хто любіць і не забывае свой дом.
3. Хто з гонарам усведамляе, што няма краіны ў свеце лепш за нашу.
4. Хто гатовы штодня сваёй працай праслаўляць родны край.
5. Гатовы стаць на абарону Айчыны і аддаць жыццё за свой народ.
6. Адстойвае прэстыж роднай краіны.
7. Ведае дзяржаўную сімволіку.
8. Шануе культурную спадчыну сваёй дзяржавы.
9. Той, хто адстойвае гонар сваёй краіны.
10. Будуе сваю будучыню, звязваючы яе толькі са сваёй Радзімай.
11. Ведае сваю родную мову.
12. Ведае гісторыю сваёй краіны, ганарыцца подзвігамі сваіх землякоў

**Праца са слоўнікам**

Патрыёт запазычана з франц. словы pater –«бацька», якое мае значэнне «заступнік, абаронца». Усе гэтыя словы маюць адзін сэнс і мяркуюць любоў да Радзімы, гатоўнасць падпарадкаваць свае інтарэсы інтарэсам краіны, імкненне абараняць інтарэсы Айчыны і свайго народа.

Патрыятызм – гэта асаблівае пачуццё, якое спалучае любоў і абавязак.

**Дыскусійная гутарка “Патрыёт- гэта чалавек…..”**

*Прыкладныя адказы вучняў*

“Патрыёт у маім разуменні – абаронца Радзімы, які гатовы змагацца да апошняй кроплі крыві і памерці за свой народ”.

“Патрыёт – гэта чалавек, які любіць сваю Радзіму, гатовы яе абараняць, але зусім не абавязкова са зброяй у руках. Ведаць гісторыю сваёй краіны, як бы пра яе не казалі – гэта важна, і асабліва сёння”.

“Сапраўдны патрыёт, на мой погляд, павінен ведаць гісторыю сваёй краіны. І ён не стане крычаць на кожным кроку пра сваю любоў да Айчыны. Штодня будзе моўчкі працаваць, і так рэальна дапамагаць Радзіме”.

***Дыдактычная гульня-лата “Сапраўдныя патрыёты”*** (дасягненні беларускага народа ў гады вайны і мірны час)

**Дыдактычная гульня-лата “Сапраўдныя патрыёты”**

| | |
|---|---|
| Беларускі паэт. Аўтар верша “Спадчына”.<br>Ад прадзедаў спакон вякоў<br>Мне засталася спадчына… | Беларуская біятланістка, чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка, двухразовая чэмпіёнка свету |
| Стваральнік легендарнага ансамбля “Песняры”,<br>яркі выканаўца, кампазітар. | Герой Савецкага Саюза, пад яго кіраўніцтвам Беларусь дасягнула значных поспехаў ва ўсіх галінах эканомікі, стаўшы адной з вядучых рэспублік Савецкага Саюза |
| Савецкі і беларускі касманаўт, двойчы Герой Савецкага Саюза | Беларуская пісьменніца і журналіст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры |

| | |
|---|---|
|  |  |
|  |  |
|  |  |

***Настаўнік:*** Быць патрыётам – значыць быць гаспадаром на сваёй зямлі, а не госцем. А ў выпадку небяспекі здолець абараніць яе. Асабліва ярка гэта цудоўная чалавечая якасць выявілася падчас вайны. Патрыятызм праяўлялі воіны, якія абаранялі родную краіну, праяўлялі тыя, хто дні і ночы працаваў у тыле, вырошчваў хлеб. Галоўным багаццем любой краіны заўсёды з'яўляецца яе народ. І сёння многія нашы суайчыннікі па праву лічацца сапраўднымі патрыётамі. Давайце ўспомнім іх слаўныя імёны.(вучні называюць імёны патрыётаў сваёй малой радзімы))

***Індывідуальная праца “Партрэт патрыёта”***

Кожны навучэнец атрымлівае працоўны ліст, у якім дапаўняе сказы.

***Настаўнік:*** Як вы лічыце, сябры, вас можна назваць зараз патрыётамі? Калі вы добра вучыцеся, дапамагаеце сваёй школе, бацькам, удзельнічаеце ў розных акцыях, напрыклад, віншаванне ветэранаў з Днём Перамогі? Вядома, пакуль юныя, але сапраўдныя патрыёты. Паспрабуйце скласці самастойна партрэт чалавека, якога лічаць патрыётам (вучні запаўняюць працоўны ліст).

**Працоўны ліст**

Працягніце сказ: Патрыёт – чалавек, які

любіць ______________________________________________________

абараняе________________________________________________________

паважае_________________________________________________

перажывае_____________________________________________________

ганарыцца______________________________________________________

памятае___________________________________

**III. Заключная частка**

***Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія***

Прыём “Чароўная кветка” (усе становяцца ў кола)

***Настаўнік:*** Я ўпэўнена, што ўсіх нас аб’ядноўвае агульнае пачуццё патрыятызму. І пакуль будзе жыць любоў да роднай зямлі і гонар за нашу Радзіму, Беларусь будзе квітнець. Я трымаю “чароўную кветку”, кожны з вас, хто возьме ў рукі яе, павінен падумаць і сказаць, што вы будзеце рабіць ці можа быць зрабілі, каб лічыць сябе сапраўдным патрыётам. Затым вы перадаяце кветку аднакласніку, і ён таксама адкажа на гэта пытанне.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Андрушкевіч, А.М. Расціць патрыётаў / А.М. Андрушкевіч // Пазашкольнае выхаванне. – Серыя "У дапамогу педагогу". – 2008. – № 5. – С. 17-19. – Рэспубліканская патрыятычная акцыя навучэнцаў “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”.
2. Паўлава, Л. "За родную Беларусь!" / Л. Паўлава // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 6. – С. 77-78.